9(С)17
З-121

М.М.Забаўскі. У.С.Пуцік

# Прадстаўніцтва ад Беларусі ў Дзяржаўнай думе Расіі

## (1906 – 1917 гг.)

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка

М.М.Забаўскі, У.С.Пуцік

# Прадстаўніцтва ад Беларусі ў Дзяржаўнай думе Расіі

(1906 – 1917 гг.)

7568
Беларускі дзяржаўны
педагагічны універсітэт
БІБЛІЯТЭКА

Мінск 1998

УДК 947.083(476)
ББК 63.3(4 Беі)521
З 12

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ імя М.Танка

Рэцэнзенты: І.В.Аржахоўскі, доктар гістарычных навук, прафесар; В.М.Фамін, доктар гістарычных навук, прафесар

Асвятляецца перадвыбарная барацьба палітычных партый і дзейнасць дэпутатаў ад беларускіх губерняў у Расійскай Дзяржаўнай думе (1906–1917 гг.). Прыведзены біяграфічныя звесткі дэпутатаў і копіі афіцыйных дакументаў перыяду думскай манархіі ў Расіі.

Адрасуецца студэнтам гістарычных факультэтаў, а таксама ўсім, хто цікавіцца пытаннямі гісторыі.

ISBN 985-435-077-0

© М.М.Забаўскі, У.С.Пуцік, 1998

# Уводзіны

Рэвалюцыя 1905 г. якасна змяніла дзяржаўны лад Расійскай імперыі: замест неабмежаванай самадзяржаўнай ўлады была ўсталявана канстытуцыйная манархія, але апошняя не здолела перамяніць сваіх палітычных пазіцый і агульнага напрамку палітычнага вектара ў дзяржаве. Падзеі 1905 г. яшчэ далей размежавалі апазіцыю і ўрад, абвастрылі супярэчнасці ў грамадстве.

1905 г. азнаменаваў трыумф рускага лібералізму – яго праграмы, стратэгіі і тактыкі. Менавіта "Саюз вызвалення" і яго філіялы, земскі рух і "Саюз саюзаў", што ўзначальвалі да сярэдзіны восені 1905 г. рэвалюцыйны рух у дзяржаве, вынікам якога стала Усерасійская кастрычніцкая забастоўка, прымусілі ўрад дараваць Расіі канстытуцыю і ўвесці парламенцкае кіраванне [1].

Але рэвалюцыйны вопыт 1905 г., палітычныя дасягненні, кастрычніцкая эйфарыя выклікалі яшчэ больш радыкальныя настроі ў імперыі. Не здзіўляе тое, што і радыкалы, і ліберальная апазіцыя, і ўрад, якія не жадалі наладжваць супрацоўніцтва ды шукаць кампрамісаў, убачылі ў заснаванні Дзяржаўнай думы, яе працы арэну палітычнай барацьбы, у якой апанент абавязкова павінен быць знішчаны.

Палітыка-прававыя фактары, што прывялі да трансфармацыі дзяржаўнага і палітычнага ладу Расіі, сталі праяўляцца задоўга да рэвалюцыйных падзей 1905 г.[2] Змена кіраўнікоў дзяржавы заўсёды выклікала надзеі на лепшую будучыню, адкрывала новыя перспектывы. Аднак Мікалай II, насуперак пажаданням расійскага грамадства, у выступленні 17 студзеня 1895 г. перад дэпутатамі ад дваранства, земстваў і гарадоў назваў "бессэнсоўнымі марамі" надзеі на ўдзел прадстаўнікоў земстваў у справах унутранага кіравання, дапусціўшы пры гэтым прыкметную абмоўку.

У тэксце прамовы, падрыхтаваным для маладога імператара К.П.Пабеданосцавым, гаварылася не пра бессэнсоўнасць, а пра "беспадстаўнасць" такіх спадзяванняў. Дадзенай абмоўкай самадзяржаўе як бы паставіла кропку ў раздзеле пра народнае прадстаўніцтва, напісаным у XIX ст.[3] Аб'ектыўны ход падзей, агульнаеўрапейскі гістарычны працэс

---

[1] Пайпс Р. Русская революция. М., 1994. С. 61.

[2] Исаев И.А. История государства и права России. М., 1996. С. 235.

[3] Кирьянов И.К., Лукьянов М.В. Парламент самодержавной России: Государственная дума и ее депутаты. 1906 – 1916. Пермь., 1995. С. 8.

рана ці позна прымусіў бы Расійскую імперыю трансфармаваць сваю палітычную сістэму: неабмежаваную самадзяржаўную ўладу абмежаваць законам і забяспечыць яе незалежнымі палітычнымі суб'ектамі (установамі), а грамадзянскую свабоду замацаваць палітычнай свабодай.

Што тычыцца зыходнага пункта адліку, даўшага кірунак падзеям, у выніку якіх у 1905–1907 гг. быў трансфармаваны дзяржаўны лад Расійскай імперыі, то многія даследчыкі першай расійскай рэвалюцыі знаходзяць яго ў лютым 1899 г. Дакладней кажучы, гэта 8 лютага – дзень святкавання з нагоды заснавання Санкт-Пецярбургскага універсітэта. Забарона з боку ўлад правядзення мерапрыемстваў у Імператарскім Санкт-Пецярбургскім універсітэце вылілася ў масавы пратэст студэнцтва, з якім праявілі салідарнасць шэраг універсітэтаў імперыі.

У хуткім часе ў адказ на жорсткую рэакцыю ўрада – выданне "Временных правил" для універсітэтаў і прымяненне іх 11 студзеня 1901 г. (распараджэнне аддаць у салдаты 183 студэнтаў Кіеўскага і 27 Санкт-Пецярбургскага універсітэтаў) – студэнт П.В. Карповіч страляў у міністра народнай адукацыі М.П. Багалепава і смяротна раніў яго. Міністр стаў першай ахвярай новай хвалі тэрору, які ў наступныя гады забраў тысячы жыццяў. Сучаснікі лічылі, што меры Багалепава і яго смерць азнаменавалі пачатак новай рэвалюцыйнай эры[1].

Першымі гістарычнымі падзеямі становяцца наступныя. У красавіку 1902 г. студэнт-радыкал С.В. Балмашоў забівае міністра ўнутраных спраў Дз.С. Сіпягіна. Вясной 1902 г. пачашчаюцца сялянскія бунты і забастоўкі. У маі 1902 г. адбываецца першы з'езд, на якім распрацоўваюцца пытанні земскага кіравання. 1903 г. азнамяноўваецца ўсеагульнай забастоўкай прадпрыемстваў на поўдні Расіі. У студзені 1904 г. Расія аказваецца ўцягнутай у вайну з Японіяй, і няўдачы на франтах абвастраюць абстаноўку ў дзяржаве. 15 ліпеня 1904 г. эсэр Я.С. Сазонаў забівае міністра ўнутраных спраў В.К. Плеве, трагічная смерць якога не толькі азначае зыход з палітычнай арэны аднаго з самых актыўных і разумных абаронцаў старога рэжыму, але і сімвалізуе завяршэнне эпохі "бескампраміснага кансерватызму".

Новы міністр унутраных спраў П.Дз. Святаполк-Мірскі 22 лістапада 1904 г. на прыёме ў імператара другі раз на працягу двух месяцаў зацвердзіў сваё "credo": "... калі не здзейсніць ліберальных рэформ і не за-

[1] Пайпс Р. Русская революция. С. 18.

даволіць цалкам натуральных жаданняў усіх, то перамены будуць усё роўна, але ўжо ў якасці рэвалюцыі... жаданне грамадскай большасці "добранамерных" людзей наступнае: не закранаючы самадзяржаўя, сцвердзіць у Расіі законнасць, шырокую верацярпімасць і ўдзел у заканадаўчай працы"[1]. Ён заявіў пра неабходнасць даверлівых адносін да грамадскіх і саслоўных арганізацый, намеціўшы тым самым новы курс унутранай палітыкі.

Яшчэ ў першыя дні лістапада П.Дз. Святаполк-Мірскі прыступіў да падрыхтоўкі ўсепадданейшага даклада, у якім збіраўся выкласці "праграму пераўтварэнняў унутранага ладу імперыі...". 24 лістапада ён паставіў свой подпіс пад "Всеподданнейшим докладом о необходимости реформ государственных и земских учреждений и законодательства" [2]. У якасці першапачатковых пераўтварэнняў меркавалася ўвесці ў склад Дзяржаўнага савета і яго дэпартаментаў прадстаўнікоў ад 34 земскіх губерняў і па прызначэнні цара – ад астатніх мясцовасцяў [3].

З тэкстам даклада Мікалаю II быў прапанаваны таксама і праект указа, але на "асобнай нарадзе" пад старшынствам імператара ключавы пункт быў адхілены, на што Святаполк-Мірскі адрэагаваў прашэннем аб адстаўцы. 13 снежня 1904 г. на дакладзе ў цара ён сказаў: "Дай Божа, каб я памыляўся, але перакананы, што праз 6 месяцаў Вы будзеце раскайвацца, што скасавалі пункт пра выбарных " [4].

Палітычны крызіс пачатку 1905 г., расстрэл дэманстрантаў у сталіцы 9 студзеня, пацвердзіў асцярогу міністра ўнутраных спраў. Савет міністраў вярнуўся да разгляду пытання аб народным прадстаўніцтве 3-га і 11 лютага 1905 г. Большасць удзельнікаў нарады выказалася за ўвядзенне ў Расіі "заканадаўча-дарадчага" народнага прадстаўніцтва [5].

Спробы адшукаць выйсце з крызіснай сітуацыі, шляхі яе вырашэння выразна праявіліся на працягу чатырох сакрэтных пасяджэнняў пад старшынствам імператара, што адбыліся ў 1905–1906 гг. На гэтых пасяджэннях разглядаўся шырокі спектр праблем, звязаных з рэформай дзяржаўнага ладу Расіі: выбарчая сістэма і паўнамоцтвы Дзяржаўнай думы і Дзяржаўнага савета, прэрагатывы манарха, асноўныя дзяржаўныя законы Расійскай імперыі [6].

Сістэма прадстаўнічых інстытутаў уводзілася ў Расіі Маніфестам

---

[1] Дневник кн. Е.А. Святополк-Мирской за 1904 – 1905 гг. // Исторические записки. М., 1965. Т. 77. С. 258.

[2] Кирьянов И.К., Лукьянов М.В. Парламент самодержавной России... С. 19.

[3] Тамсама. С. 20.

[4] Дневник кн. Е.А. Святополк-Мирской за 1904 – 1905 гг. Т. 77. С. 266.

[5] Кирьянов И.К., Лукьянов М.В. Парламент самодержавной России... С. 20.

[6] Тамсама.

6 жніўня 1905 г. і канчаткова зацвярджалася "Асноўнымі дзяржаўнымі законамі" ад 23 красавіка 1906 г. Паводле першапачатковага праекта ад 6 жніўня 1905 г., булыгінская Дума мелася на мэце як практыка земскіх сабораў: "народу меркаванне, цару – улада". Яна прапаноўвалася як "заканадаўча-дарадчае ўстанаўленне", што абіраецца на аснове цэнзавага прадстаўніцтва. Аднак у перыяд нарастаючага палітычнага крызісу (лета – восень 1905 г.) гэта ужо не магло задаволіць апазіцыю.

Хваляванні рабочых і студэнтаў у Маскве і Санкт-Пецярбургу прынялі ўсерасійскі размах у кастрычніку, калі з імі з'ядналіся выступленні чыгуначнікаў. Так разгортвалася ўсерасійская палітычная стачка, што паралізавала ўсю дзяржаву.

З мэтай папярэдзіць катастрофу С.Ю. Вітэ, прызначаны 13 кастрычніка старшынёй Савета міністраў, выказаўся за тое, каб задаволіць патрабаванні лібералаў, выкладзеныя ў праграме "Саюза саюзаў", і тым самым ізаляваць радыкальны элемент. За аснову праекта маніфеста, прапанаванага А.Дз. Абаленскім і С.Ю. Вітэ, былі ўзяты рэзалюцыі земскага з'езда, які праходзіў у Маскве 12–15 верасня.

Усё яшчэ не да канца пераканаfamы, цар папрасіў вялікага князя Мікалая Мікалаевіча прыняць дыктатарскія правы. Вялікі князь, па словах барона У.Б. Фрыдэрыкса, адзначыў, што сіл для ўстапявання ваеннага дыктату недастаткова і што, калі цар не падпіша маніфест, ён застрэліцца [1].

Вось як апісвае гэтыя падзеі, са слоў барона У.Б. Фрыдэрыкса, у сваіх "Успамінах" С.Ю. Вітэ: "Як толькі я вярнуўся да сябе, прыязджае вялікі князь Мікалай Мікалаевіч. Я абвяшчаю яму ўсе здарэнні і кажу: неабходна ўсталяваць дыктатуру і ты (барон Фрыдэрыкс з вялікім князем быў на ты) павінен узяць на сябе дыктатарства. Тады вялікі князь вымае з кішэні рэвальвер і гаворыць: ты бачыш гэты рэвальвер, вось я зараз пайду да гасудара і буду маліць яго падпісаць маніфест і праграму Вітэ; ці ён падпіша, ці я пушчу сабе пулю ў лоб з гэтага рэвальвера, – і з такімі словамі ён ад мяне хутка пайшоў. Праз некаторы час вялікі князь вярнуўся і перадаў мне распараджэнне перапісаць у канчатковым выглядзе маніфест і даклад і затым... прывесці гэтыя дакументы гасудару на подпіс" [2].

У той жа вечар, 17 кастрычніка 1905 г., імператар падпісаў "Маніфест аб удасканаленні дзяржаўнага ладу", якім прадугледжвалася:

1. Дараваць насельніцтву непахісныя асновы грамадзянскай

---

[1] Витте С.Ю. Воспоминания: В 3 т. Таллинн, 1994. Т. 3. С. 40.
[2] Тамсама.

свабоды на пачатках сапраўднай недатыкальнасці асобы: свабоды сумлення, слова, сходаў і саюзаў.

2. Не перапыняючы аб'яўленых выбараў у Дзяржаўную думу, прыцягнуць да ўдзелу ў іх (паколькі часу да склікання Думы заставалася мала) тыя класы, якія не валодалі выбарчымі правамі.

3. Прыняць за правіла: ніякі закон не мае сілы без зацвярджэння яго Дзяржаўнай думай; народным абраннікам павінна забяспечвацца магчымасць нагляду за законнасцю дзеянняў улад.

З аб'яўленнем Маніфеста рэвалюцыйныя выступленні, як адзначыў Р. Пайпс, пачалі адбывацца радзей. Аднак два аспекты, звязаныя з падпісаннем гэтага дакумента, патрабуюць тлумачэнняў, без якіх цяжка зразумець падзеі апошняга дзесяцігоддзя царскага рэжыму.

Па-першае, Маніфест быў выдадзены царом пад націскам, нават пад пагрозай смерці, таму Мікалай II ніколі не лічыў сябе маральна абавязаным сувымяраць з ім свае дзеянні.

Па-другое, у Маніфесце няма слова "канстытуцыя". Гэта было зусім не выпадкова. І хаця часам сцвярджаецца, нібыта цар не разумеў, што гаворка ідзе пра канстытуцыю, сучасныя крыніцы не пакідаюць сумненняў у тым, што ён добра разбіраўся ў сутнасці зробленых ім уступак.

Як чалавек глыбока веруючы, Мікалай II, здаецца, да канца жыцця не мог змірыцца з гэтым учынкам і пакутаваў ад таго, што сумняваўся ў правільнасці сваіх дзеянняў у час кастрычніцкіх падзей 1905 г. Парушыўшы каранацыйную клятву, якая даецца ў першую чаргу Богу, але з'яўляючыся сімвалам адзінства імперыі, яе атаясамленнем, Мікалай II у наступнае дзесяцігоддзе свайго царствавання больш засяроджваўся на сабе і сваёй сям'і.

11 снежня 1905 г., пасля разгрому маскоўскага ўзброенага паўстання, урад выдаў указ "Аб змяненні палажэння пра выбары ў Дзяржаўную думу", якім значна пашыралася кола выбаршчыкаў. Да трох выбарчых курыяў – землеўладальніцкай, гарадской і сельскай – дадавалася чацвёртая – рабочая. Практычна ўсе насельнікі-мужчыны ва ўзросце больш за 25 гадоў, акрамя салдат, студэнтаў, падзённых рабочых ды часткі качэўнікаў, атрымалі выбарчае права. 20 лютага 1906 г. выйшаў Найвышэйшы Маніфест "Аб змяненні ўсталявання Дзяржаўнага савета і пераглядзе ўсталявання Дзяржаўнай думы". У новым "Усталяванні Дзяржаўнай думы" азначаліся: склад і ўпарадкаванне Дзяржаўнай думы, яе кампетэнцыя, парадак вядзення спраў, унутраная арганізацыя.

23 красавіка 1906 г. былі зацверджаны "Асноўныя дзяржаўныя законы" – фактычна першая руская канстытуцыя. "Усталяванне Дзяржаўнай думы" і "Усталяванне Дзяржаўнага савета" былі ўключаны ў тэкст

"Асноўных законаў". Сучасным дзяржавазнаўствам пад канстытуцыяй разумеецца асноўны закон дзяржавы, які выяўляе волю дамінуючых грамадскіх сіл, фіксуе прынцыпы дадзенай грамадскай і дзяржаўнай пабудовы, структураванне і дзейнасць грамадскіх органаў, асноўныя правы і абавязкі насельніцтва і г. д.

Але менавіта "Асноўныя дзяржаўныя законы" 1906 г. замацавалі ўпарадкаванне Расійскай імперыі (арт. 1–2), дзяржаўную мову (арт. 3), існаванне вярхоўнай улады (арт. 4–25), парадак заканадаўства (арт. 84–97), прынцыпы арганізацыі і дзейнасці цэнтральных інстытутаў: Дзяржаўнага савета і Дзяржаўнай думы (арт. 98–119), Савета міністраў і міністэрстваў (арт. 121–124), а таксама правы і абавязкі расійскіх падданых (арт. 69–83), становішча праваслаўнай царквы, апісанне дзяржаўнага герба (арт. 61) ды інш.[1]

Устаноўленыя такім чынам асобая юрыдычная сіла законаў і іх змест былі ўласцівыя манархічным канстытуцыям. Вось чаму немагчыма аспрэчыць тое, што "Асноўныя законы" Расіі 1906 г. могуць быць аднесены да катэгорыі канстытуцыі.

Не менш важнае для гісторыі канстытуцыяналізму ў Расійскай імперыі і пытанне, ці з'яўляліся парламенцкімі інстытутамі з прававога пункту гледжання рэарганізаваны Дзяржаўны савет і Дзяржаўная дума.

У сучасным дзяржавазнаўстве парламентам лічыцца агульнадзяржаўны прадстаўнічы орган, што складаецца з адной або дзвюх палат і валодае прэрагатывамі прымаць законы, зацвярджаць бюджэт і ў той ці іншай ступені кантраляваць урад. Дзяржаўная дума (ніжняя палата) і Дзяржаўны савет (верхняя палата), без сумнення, мелі шэраг правоў, спецыфічных для парламента: права валодаць заканадаўчай ініцыятывай па ўсіх аспектах заканадаўства, за выключэннем "Асноўных дзяржаўных законаў "; рабіць запыты да членаў урада; карыстацца "поўнай свабодай меркаванняў і думак", а таксама дэпутацкай недатыкальнасцю.

Такім чынам, з фармальна юрыдычнага пункту гледжання Дзяржаўная дума і пераўтвораны Дзяржаўны савет у значнай ступені адпавядалі асноўным крытэрыям, якія спараджаліся канстытуцыйным правам [2].

---

[1] Либеров И.П., Марголис Ю.Д., Юрковский Н.К. Традиции демократии и либерализма в России // Вопросы истории. 1996. № 2. С. 12.

[2] Тамсама. С. 13.

# Заключэнне

Пытанне аб народным прадстаўніцтве разглядалася ў праграмах амаль усіх палітычных аб'яднанняў. Сацыял-дэмакраты і эсэры выступалі за народнае прадстаўніцтва, заснаванае на прамым, усеагульным і роўным выбарчым праве пры тайным галасаванні. Аднак члены гэтых партый лічылі, што рэальнае народнае прадстаўніцтва можа быць толькі пасля звяржэння самадзяржаўя і правядзення Устаноўчага сходу.

Флагманы лібералаў – кадэты і акцябрысты – прысвяцілі Думе цэлыя раздзелы сваіх праграм. Але калі першыя разглядалі Думу як фактар ціску на ўрад, то другія настройваліся на ўзаемадзеянне з самадзяржаўем дзеля вырашэння надзённых праблем.

Правыя лічылі, што Дзяржаўная дума неабходна для ўсталявання непасрэднай сувязі паміж дзяржаўнай воляй цара і правасвядомасцю народа.

Такім чынам, толькі лібералы былі схільныя да таго, каб надаваць увагу парламенцкай дзейнасці. Аднак у выніку імклівых змен у палітычным жыцці краіны ў трэцячэрвеньскі час хутка скарацілася колькасць прыхільнікаў парламентарызму сярод палітыкаў імперыі. Найбольш яскрава збліжэнне пазіцый розных палітычных сіл праявілася ў стварэнні і дзейнасці "Прагрэсіўнага блока". І толькі дубровенцы закпікалі да самых жорсткіх мер у барацьбе з апазіцыяй. Не патрэбна была парламенцка-прававая Расія і бальшавікам.

Гісторыя расійскага парламента – гэта хутчэй гісторыя канфрантацый, у лепшым выпадку – сапернiцтва з самадзяржаўем. Меў рацыю той, у каго было больш правоў: урад нязменна браў верх, а вельмі сваявольныя думы разганяліся.

У паслялютаўскай палітычнай сітуацыі Дума не змагла вызначыцца. 6 кастрычніка 1917 года Часовы ўрад прыняў пастанову аб роспуску Думы ў сувязі з падрыхтоўкай выбараў ва Устаноўчы сход, а 18 снежня дэкрэтам СНК была спынена дзейнасць канцылярый Думы і Часовага камітэта.

Расійскі парламент перастаў існаваць. Галоўную ролю адыграла тое, што не было падтрымкі прадстаўнічых устаноў з боку грамадства. У Расіі адсутнічала традыцыя цывілізаваных палітычных паводзін, кампраміснага вырашэння сацыяльных і палітычных канфліктаў.

У свядомасці значнай часткі грамадзян дамінавала ідэя грубай ураўняльнасці і жорсткага сацыяльнага кантролю. Для грамадства з такім менталітэтам парламентарызм, які грунтаваўся на ліберальных ідэалах асабістай свабоды , кампрамісу, быў з'явай далёкай.

# ЗМЕСТ


УВОДЗІНЫ ........ 3

ГЛАВА 1. ПЕРШАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ДУМА (27.04 – 08.07.1906 г., АДНА СЕСІЯ) ........ 9

ДЭПУТАТЫ АД БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ
У ДЗЯРЖАЎНАЙ ДУМЕ ПЕРШАГА СКЛІКАННЯ ........ 16

ГЛАВА 2. ДРУГАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ДУМА (20.02 – 02.06.1907 г., АДНА СЕСІЯ) ........ 24

ДЭПУТАТЫ АД БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ
У ДЗЯРЖАЎНАЙ ДУМЕ ДРУГОГА СКЛІКАННЯ (У.С.ПУЦІК) ........ 30

ГЛАВА 3. ТРЭЦЯЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ДУМА (01.11.1907 – 09.06 1912 г., ПЯЦЬ СЕСІЙ ) ........ 35

ДЭПУТАТЫ АД БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ
У ДЗЯРЖАЎНАЙ ДУМЕ ТРЭЦЯГА СКЛІКАННЯ ........ 41

ГЛАВА 4. ЧАЦВЁРТАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ДУМА (16.11.1912 – 06.10.1917 г., ПЯЦЬ СЕСІЙ) ... 46

ДЭПУТАТЫ АД БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ
У ДЗЯРЖАЎНАЙ ДУМЕ ЧАЦВЁРТАГА СКЛІКАННЯ. ........ 69

ЗАКЛЮЧЭННЕ (М.М.ЗАБАЎСКІ) ........ 63

ДАДАТАК ........ 64

Навуковае выданне

Забаўскі Мікалай Міхайлавіч,
Пуцік Уладзімір Станіслававіч

# Прадстаўніцтва ад Беларусі ў Дзяржаўнай думе Расіі

## (1906 – 1917 гг.)

Рэдактар А.В.Фіялкоўская

Падпісана ў друк 10.04.98. Фармат 60x84 1/16. Папера пісчая.
Афсетны друк. Ум. друк. арк. 9,9. Ул.-выд. арк. 8,8.
Тыраж 300 экз. Заказ 397. Цана 45000 руб.

Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка
Ліцэнзія ЛВ № 196 ад 04.02.98 г.

Ратапрынт БДПУ імя М.Танка. 220050, Мінск, вул. Савецкая, 18